Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 22 (51) Пятніца, 8-га ліпня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выход ... Цана нумару 20 грош.

Нацыянальна ... рыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократы ... мунізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода. Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Пад ... месяц 1 зл. ... 2 зл. ... даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФРОНТ.

У Заходняй Беларусі беларускі палітычны рух дыфэрэнцаваўся галоўным чынам паводле двух прынцыпаў: сацыяльнага і нацыянальнага.

Да апошняга часу вялікая большасьць беларускіх палітычных групаў і партыяў кіравалася прынцыпам сацыяльным. Пачынаючы ад 1906 году, беларускае арганізаванае грамадзянства перахварэла на ўселякага роду і ахварбоўкі сацыялістычныя партыі. Тут была і „Сацыялістычная Грамада„ і „Беларускія Эсэры“ і „Народныя Нацыяналісты“ і „Эндэкі“ і г. д.

Да 1920 году ўсе гэтыя сацыялістычныя партыі нагэтулькі выірадзіліся, што літаральна засталося толькі два сацыялісты — эсэры. Затое на грунце клясовым вырасьлі новыя групы, новага напрамку: — Грамада і Сель-Саюз.

І, калі Грамада выразна ў сваёй праграме стала на грунт ня толькі не нацыянальны (бо інтэрнацыяльны!), а іскрава сацыяльны, пралетарска-работніцкі, дык „Сель-Саюз“ прабаваў стаць на грунт клясова-сялянскі.

Грамада, як арганізацыя нацыянальна-беларуская, страціла ўселякае значэньне ў беларускім адраджэным руху. Яна, праўда, яшчэ істнуе, хаця і падпольна, але выключна пітаецца сокамі ненавісьці да палякаў і абшарнікаў, незадаволеная з гаспадарчага стану на крэсах і г. д. Яна жыве выключна на падложу дрэннага крэсовага жыцьця, ня маючы пазытыўна творчай праграмы.

Ідэя Сель-Саюзу—думка добрая.

Сялянства, як галоўная складовая частка беларускага Народу, павінна адыгрываць у Народзе адпаведную, а нават галоўную ролю. Але, на няшчасьце, ідэя тварэньня Сель-Саюзу трапіла ў нездатныя рукі, якія і самую ідэю зганьбілі і справу арганізацыйную правалілі. Можна цяперака сказаць ўжо зусім сьмела, што правадыры Сель-Саюзу занеахвоцілі да свайго саюзу нават саміх сялян. Але галоўнае праступленьне перад Народам, якога дапусьцілася і Грамада і Сель-Саюз, — гэта было тое, што яны разьбілі беларускі нацыянальны фронт. Праз овае чырвона-пралетарскія акуляры Грамада усіх лічыла здраднікамі, думаючы апанаваць усю беларускую нацыю.

Глыбока памыліліся!

А блізарукі, глупенькі Ярэміцка-Рагульскі Сель-Саюз сваімі дзікімі, бруднымі, пэрсанальнымі выпадамі, гультайствам і абсолютнай нездольнасьцю да арганізацыі разтрасціў з свайго складу нават тых нялічных адзінак, якія яму па прыяцельску, як слушна зазначыў Я. Станкевіч, „пазычылі хадэкі“.

Але быў яшчэ адзін фактар, які праглядзелі і Грамада і Сель-Саюз, — гэта слабасьць беларускага палітычнага і нацыянальнага руху і недасьпеласьць грамадзянства для тварэньня вышэйшага парадку груп і ровак, якімі зьяўляюцца чыста пралетарска-работніцкая, альбо чыста сялянская арганізацыі.

І вось у сьвядомасьці і ў адчуваньні слабасьці маладога беларускага адраджэнчага руху зьявілася абсолютная патрэба еднаньня **усіх** сьвядомых **сілаў па прынцыпу** не **сацыяльнаму, а нацыянальнаму**. Гэты прынцып сьмела, праканана і, спачатку маючы надта малы лік прыхільнікаў, выдвінула Беларуская Нацыянальная Рада.

Сяньня мы падводзім першыя ітогі рэальнай спробы актыўнага дзейства беларускага грамадзянства пад шырокім нацыянальным сьцягам. І ў той час, як Грамада і Сель-Саюз зганьбілі імя Беларусаў у нашай быўшай слаўнай сталіцы — Вільні, ідучы на запятках расейцаў, як зрабіў Ярэміч, альбо ў хвасьце комуністычных міжнародных адбросаў, як гэта зрабіла Грамада, — Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт адтрымаў вялікую перамогу, праведшы ўсюды ў урады, дзе ён толькі прыймаў удзел у выбарах, 80 проц. сьвядомых, шчырых беларусаў!

Вось гэты першы пасьпех арганізаванага беларускага грамадзянства пад сьцягам нацыянальнай **Згоды і Еднасьці** сьведчыць аб правідловасьці лініі, якую ўзялі Беларуская Нац. Рада і Бел. Нац. Партыя.

Апрача ўсяго значэньня факту праведзеньня Бел. Нац. Выб. Камітэтам 80 проц. беларусаў у самаўрады — гэты пасьпех павялічваецца яшчэ тым, што гэтыя 80 проц. прадстаўляюць найбольш сьвядомыя, паважныя грамадзка-дасьпелыя элементы, якія да гэтага яшчэ з'едналы адзінствам нацыянальнай ідэі і жаданьнем творчай, спакойнай працы ў самаўрадах для карысьці насяленьня. Гэткія людзі будуць бязумоўна добрымі, грамадзянскімі дзеячамі на самаўрадавым полі.

Нарэшце яшчэ адно вялікае значэньне мае пасьпех выбарчай акцыі Бел. Нац. Камітэту — гэта новы, глыбокі, моральны разгром разьбіткаў Грамады.

Сіла грамады была ў тым, што правадыры яе выхоўвалі сваіх сябраў у няпрымірымым духу да ўсіх іншых групаў, а асабліва да нашай групы. І вось падчас выбараў б. грамадаўцы масамі йшлі даНацыянальнаго Выбарчага Камітэту і гэтак шчыра і актыўна працавалі ў ім, што некаторыя з іх трапілі ў нашыя нацыянальныя сьпіскі кандыдатаў да радаў гмінных і нават да самых гмінаў.

Гэтае зьявішча ёсьць яшчэ адным з доказаў, што: 1) Грамада глыбокіх корняў ня мае і 2), што чыста-нацыянальны кірунак ахопліве чым дальш, тым больш шырокія кругі беларускага грамадзянства.

ВОСТРАЯ БРАМА ў ВІЛЬНІ.



2 ліпня адбылася урачыстая каранацыя цудоўнага абразу Маці Божай Вострабрамскай пры удзеле вышэйшых прадстаўнікоў цывільнай і духоўнай улады і многіх тысячаў багамольцаў з усіх куткоў Дзяржавы.

ВЫБАРЫ ДА ГМІННЫХ САМАЎРАДАЎ.

СЛОНІМСКІ ПАВЕТ.

1. Гміна БЫТЭНЬ — — —	12	асоб.
З іх: са сьпіска белар Нацыян —	3	„
„ гурткоўцаў —	3	„
„ асаднікаў — —	3	„
„ жыдоў — — —	3	„
2. ЧЭМЭРЫ— — — —	12	„
з іх: белар. Нацыянальн. — —	8	„
„ гурткоўцаў — —	1	„
„ абшарнікаў — —	2	„
„ асаднікаў — —	1	„
3. ДЭРЭУКА— — — —	12	„
з іх: белар. Нацыян — —	4	„
„ гурткоўцаў — —	5	„
„ абшарнікаў — —	1	„
„ асаднікаў — —	2	„
4. ДЗЯРЭЧЫН— — — —	12	„
з іх бел. Нацыян. — — —	3	„
„ гурткоўцаў — —	6	„
„ жыдоў — — —	3	„
5. ДЗЕВЯТКОВІЧЫ — — —	10	асоб.
з іх бел. Нацыян. — — —	2	„
„ гурткоўцаў — —	6	„
„ абшарнікаў — —	1	„
„ асаднікаў — —	1	„
6. КАСТРОВІЧЫ— — — —	12	„
з іх: бел. Нацыян — —	3	„
„ гурткоўцаў — —	8	„
„ асаднікаў — —	1	„
7. КАЗЛОУШЧЫНА— — —	12	„
з іх: бел. Нацыян. — — —	9	„
„ гурткоўцаў — —	3	„
8. РОГОТНА— — — —	10	„
з іх: бел. Нацыян — — —	2	„
„ гурткоўцаў — —	7	„
„ абшарнікаў — —	1	„
9. ШЫДЛОВІЧЫ — — —	12	„
з іх: белар Нацыян. — —	2	„
„ гурткоўцаў — —	7	„
„ абшарнікаў — —	2	„
„ асаднікаў— — —	1	„
10. СТАРОВЕСЬ — — —	10	асоб
з іх: белар. Нацыян — —	4	„
„ гурткоўцаў— — —	5	„
„ асаднікаў— — —	1	„
11. МІЖАВІЧЫ— — — —	12	„
з іх: белар. Нацыян. — —	6	„
„ гурткоўцаў — —	6	„
12. ЖЫРАВІЦЫ— — — —	10	„
з іх: белар. Нацыян. — —	6	„
„ гурткоўцаў — —	1	„
„ абшарнікаў — —	2	„
„ асаднікаў — —	1	„

13. З КУРЫЛОВІЧ—вестак яшчэ не атрымалі

МОЛОДЭЧАНСКІ ПАВЕТ.

1. БЕНІЦКАЯ— — — —	12	„
з іх: бел, Нацыян. — — —	9	„
„ гурткоўцаў — —	1	„
„ палякаў — — —	2	„
2. ЛЕБЕДЗЕУСКАЯ — — —	10	„
з іх: бел. Нацыян. — — —	5	„
„ палякаў — — —	2	„
„ жыдоў — — —	3	„
3. МОЛОДЭЧАНСКАЯ— — —	12	„
з іх: бел. Н цыян. — — —	7	„
„ грамадаўцаў — —	1	„
„ палякаў — — —	3	„
„ жыдоў — — —	1	„
4. ГАРАДЭЦКАЯ — —	15	„
з іх: бел. Нацыян. — — —	8	„
бел. умярков. — — —	4	„
„ жыдоў — — —	3	„
5. КРАСНАСЕЛЬСКАЯ — —	10	„
з іх: бел. Нацыян. — — —	5	„
„ палякаў — — —	4	„
„ жыдоў — — —	1	„
6. ПАЛАЧАНСКАЯ — — —	10	„
з іх: бел. нацыян. — — —	7	„
бел. умярк — — —	1	„
палякаў — — —	2	„

У гмінах Ракаўскай і Радашкоўскай у гэтым пярыядзе выбары не праводзіліся, а адбыліся раней і гэтакім чынам у Маладэчанскам павеце з ліку ўсіх радных у колькасьці 81 аказаліся выбранымі беларусаў са сьпіску Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Выбарнага Камітэту — 54.
са сьпіску польскага — 15.
са сьпіску жыдоўскага — 9.
і грамадаўскага — 3.

ВАЛОЖЫНСКІ ПАВЕТ.

Ня гледзючы на тое, што на вёсках сялянам афіцыяльна нічога ня было ведама аб выбарах, аднак, дзякуючы адозвам Цэнтр. Бел Нац. Выб. Камітэту, яны былі прыгатаваны да гэтага. І, калі заўважылі рух нашых абшарнікаў і асаднікаў, дык усьлед за імі пасьпяшылі на абвадовыя сабраньні і тутака ўжо, ня гледзючы на тое, што былі сьпіскі гатовыя, запатрэбавалі ўпісаць і сваіх кандыдатаў і ў 4 абводах большасьцю галасоў правялі сваіх беларусоў. Толькі ў самым Валожынскім абводзе ніхто з сялян-беларусаў ня ведаў аб сабраньні, дык дзякуючы гэтаму жыды правялі $^2/_3$ сваіх кандыдатаў, але нашыя беларусы паслалі пратэст пану старосьце Валожынскаму.

Наагул вынікі выбараў у Валожынскім павеце паказваюць сьвядомасьць і стойкасьць нашых беларусаў, бо дзе было ведама аб выбарах і дзе хоць трохі нашыя прыгатаваліся да гэтага ўсюды праходзілі ў большасьці беларусы.

П-віч.

Выбары у **ВІШНЕУСКАЙ** і **ЗАБРЭСКАЙ** гмінах адбыліся 27 чэрвеня.

У **ВІШНЕУСКАЙ** выбраны элемэнт умяркаваны.

Выбары ў **ЗАБРЭСКАЙ** запратэставаныя, бо адбыліся не правідлова, і ў склад Рады ўвайшло 5 абшарнікаў, 3 асадні і 2 не сьвядомых беларусаў.

У **ЮРАЦІШКАХ** выбары адбудуцца 28 VI. Тутака ёсьць элемэнт і „грамадаўскі, але спадзеваемся, што правядзём сьпісак нацыянальны.

С-ка.

У **ЗАБРЭСКАЙ** гміне выбары правяліся неправідлова. Большасьць выбаршчыкаў былі п'яныя. Зложаны пратэст. Сяляне надта абураны, і трэба дабіцца перавыбараў.

Т ва.

БЕЛАРУСЫ—РАДНЫЯ!

Выбары ў гмінныя Рады застаці нас, Беларусаў, непадгатаванымі, выпалі зусім не спадзёўкі. Апрача таго, беларускія арганізацыі, якія на славах гэтак гучна крычаць аб сваей руплівасьці аб Народзе, сваей беларускасьці і імкненьню да „аблагадзецельстваваньня“ Народу, усякія Грамады Сялянскія Саюзы, Пасольскій Клюб і г. д.—не зрабілі нічога для таго, каб дапамагчы сялянству у гэтак важнай для яго справе. І толькі адзін Беларускі Цантральны Нацыянальны Выбарны Камітэт, заложаны з ініцыятывы Бел. Нац. Рады і Партыі, энэргічна выступіў на выбары, заклікаючы сялян да нанацыянальнай еднасьці і арганізаваннасьці. Праца Камітэту, не бачучы на тое, што „Праўды“ дый „Нівы“ стараліся падарваць аўтарытэт яго і замест дапамагчы — перашкодзіць у высілках зарганізаваньня выбараў пад нацыянальна-сялянскім сьцягам, аднак дала багатыя рэзультаты. Усюды, куды папалі адозвы Камітэту, куды маглі даехаць інструктары — сяляне беларусы жыва зацікавіліся справай выбараў, пайшлі, як кажуць, валам і здабылі вялікую **большасьць месц у Радах.**

З мамэнту выбараў у Рады перад Раднымі адчыняюцца багатыя магчымасьці шырокай працы на карысьць нашага Народу. Ня трэ аднак забывацца, што вынікі гэтае працы цалком залежаць ад таго, як да працы падойдуць самі радныя.

Калі сярод іх узьнікне нязгода, -а аб гэтым пэўне будуць рупіцца нашыя ворагі, — калі пачнуцца партыйныя спрэчкі, барацьба ў імія нейкае праграмы ці прыналежнасьці да пэўнае групы, калі староннікі „Праўдаў„ „Ніваў“ і г. д., замест займацца працай **для Усяго Народу,** вазьмуць прыклад з сваіх павадыроў, якія толькі аб тым і рупяцца, каб неяк зваліць ды спэцкаць абзін аднаго — рэзультаты будуць толькі благія. І наадварот, калі Радныя у сваей працы будуць выступаць згодна, **арганізаванна**— Рады гмінныя будуць сапраўды самаўрадамі, сапраўды возьмуць у свае рукі ўсё гаспадарчае жыцьцё гміны і будуць кіраваць ім згодна з інтарэсамі сваіх выбаршчыкаў.

І вось, так як на выбары, і цяпер Бел. Цэнтр. Нац. Выбарны Камітэт заклікае ўсіх выбраных сябраў гмінных Радаў да еднасьці і арганізаваннасьці працы.

Радныя! — забудзьцеся аб палітычных розьніцах і партыйнасьці!

Памятуйце аб тым, што гмінная Рада ня ёсьць палітычная трыбуна і што інтэрэсы сялянства нашага ўсюды аднолькавыя.

І памятуючы гэта — арганізуйцеся **пад лёзунгам практычнай творчай працы ў самаўрадах.** Стварыце адзін вялікі Саюз беларусаў-радных.

Памятуйце, што Вашым **Заданьнем і Абавязкам** ёсьць не рабленьне нейкае палітыкі, не клясавая барацьба і іншыя брэдні „высокіх“ палітыкаў, вынікі якіх ужо адбіліся на сялянскіх баках, а выключна руплівасьць аб інтэрэсах родных вёсак, падняцьцю культурнага і гаспадарчага стану сялян і наагул — палепшаньне дабрабыту Беларускай вёскі!.

Падымаючы ініцыятыву стварэньня гэтага Саюзу, Цэнтральны Беларускі Выбарны Камітэт выбраў з пасярод сябе **Часовы Беларускі Камітэт па справам самаўрадаў,** які будзе знаходзіцца ў Вільні пры Завальнай вул. № 6 кв. 4.

Гэты Камітэт бярэ на сябе заданьне **даваць усялякія інфармацыі, праўныя і іншыя, указаньні і г. д. па ўсім пытаньням, датыкаючым справам самаўрадаў і працы ў іх, высылаць законы, інструкцыі і г. д., якія будуць адносіцца да самаўрадаў, імкнуцца да аб'еднаньня працы ўва ўсіх самаўрадах, прымае на сябе хлопаты перад уладамі па асобным справам, датыкаючым сябраў самаўрадаў і г. д.**

Нарэшці—Камітэт гэты будзе імкнуцца да стварэньня Саюзу самаўрадавых працаўнікаў—беларусаў пад лёзунгам практычнае гаспадарчае працы, апрацоўваючы Статут Саюзу і бяручы на сябе абавязак склікаяньня канфэрэнцыі радных у бліжэйшай будучыне.

Беларусы — Родныя! Нясумленныя выступленні проці Цэнтр. Бел. Нац. Выб. К-ту ворагаў беларускае нацыянальнае справы якія пад прыкрыўкай розных пекных партыйных лёзунгаў імынуліся падарваць аўторытэт Камітэту і папсуць яго працу — разьбіліся аб факты: **Камітэт адзіны паміж усіх** беларускіх арганізацыяў дақазаў, што ён сапраўды імкнецца да таго, што дае карысьць народу. Вы ўбачылі, што толькі адзін Камітэт у свой час **папярэдзіў Вас** аб выбарах, разаслаўшы па усіх беларускіх кутках выбарчыя адозвы.

Толькі Выбарны Бел. Нац. К-т прыслаў **Вам Законы** аб выбарах і самаўрадах, пераложанныя на родную мову,

Толькі Бел. Нац. Выб. К-т даў Вам усі выясьненьні і дапамогу, прыслаўшы Вам сваіх інструктараў!

Толькі дзякуючы Бел. Нац. Выб. К-ту — у самаўрады трапіла 80 проц. беларусаў.

Гэткім чынам выбары у самаўрады паказалі, хто сапраўды руціцца аб Народзе, а хто толькі сыплець пекнымі абяцанкамі, і сьцьвердзілі, што мы маем на мэці сваей працы выключна інтэрасы нашага Народу.

Заклікаючы Вас да арганізаваннасьці, К-т глыбока верыць, што кожны Беларус — радны, шчыра жадаючы працаваць на карысь свайго Народу — зразумее патрэбу гэткай арганізацыі, як Саюз радных і будзе гуртавацца вокал ініцыятыўнага часовага Камітэту па справам самаўрадаў.

У арганізацыі і еднасьці нашая сіла і залог памыснасьці нашае працы!

Дык арганізуемось-жа Беларусы—Радныя!

ЧАСОВЫ БЕЛАРУСКІ КАМІТЭТ
ПА СПРАВАМ САМАУРАДАУ.

Палітычны агляд.

Разрыў англійска-радавых адносінаў зьяўляецца зваротным пунктам у сьвятовай палітыцэ адносна Радавай Расеі. А што датычыцца забойства Войкава і наступіўшых у выніку гэтага чырвонага тэррору ў С. С. Р. Р. і абмена нотамі з Польшчай, дык гэта паслужыла для бальшавікоў толькі пажаданым повадам, які трэба было ім знайці для апраўданьня сваіх зьверскіх мэтадаў расправы з нявінным народам. Лічыць выстрал Кавэрды за прычыну бальшавіцкіх рэпрэсыяў, як гэта многія прызнаюць, гэтак сама наіўна, як і прызнаць, што сьвятовая вайна, к якой рыхтаваліся немцы, была выклікана забойствам эрцгэрцага Фэрдынанда ў Сараеве ў ліпні 1914 г. У 1917 г. былі забіты нямецкі камандуючы на Украіне гэн. Эйгорн у Кіеве і пасланнік Мірбах у Маскве, аднакжа немцы не адказалі рэпрэсіямі проці сотняў тысячаў расейцаў у Нямеччыне і ў самай Расеі, хаця ніхто ім ня мог гэтага забараніць.

Сыстэма заложнічаства, рэпрэсыяў і масавага тэррору стасуецца толькі радавым урадам,

як аснова панаваньня пралетарыяту па вучэньню сацыялістычнага бога Маркса і яго прарока Леніна. Вось дзеля чаго заклапоціліся „пралетарыі ўсіх стран“, калі забачылі, што дзікі і безразсудны чырвоны тэррор у С. С. Р. Р. зрабіў вельмі ўемнае ўражаньне ў Зах. Эўропе і Амэрыцэ.

Англійскія работнікі, карыстаўшыяся субсыдыямі Масквы ў часе леташняй забастоўкі, пратэстуюць проці стасаваньня масавых казьняў бальшавікамі бяз суда не дзеля таго, што шкадуюць расейскую інтэлігэнцыю і буржуазыю, якая у сутнасьці ўжо даўно уся вымардавана, а таму, што бачаць, як бальшавікі безнадзейна апушчаюцца ў прорву, з якой ўжо ня выбяруцца больш.

А гібель радавай улады ў Расеі, — гэта сьмярцельны ўдар для усяго сьвятовага пралетарыяту.

Англійскія ці нямецкія работнікі ў пераважнай сваей часьці можа і ня хочуць радавай сыстэмы ўрадаваньня ў сябе дома, але ім патрэбна была гэта бандыцкая сыстэма ў Расеі, як

чырвонае пужала,

якім можна палохаць сваю буржуазыю і тым ляпей яе смактаць. Вось дзеля чаго „другі інтэрнацыянал“, якога бальшавікі не называюць інакш, як „сацыял-здраднікам і лёкаем буржуазыі“ заўсёды пратэставаў проці ўсялякіх інтэрвэнцыяў капіталістычных дзяржаваў у расейска-бальшавіцкім пытаньні.

Але гэтыя пратэсты мелі сэнс і карысьць толькі да тэй пары, пакуль радавая ўлада ў Расеі мела хоць вонкавыя прызнакі трваласьці. Да гэтай пары і „буржуазныя“ дзяржавы лічыліся з бальшавікамі, як з фактычнымі панамі Расеі, з якою можна гандляваць хоць на крывавыя чырвонцы. Аднак-жа новая, нічым не апраўдываемая хваля чырвонага

тэррору, да якога зьвяртаецца усякая ўлада перад сваім канцом,

адкрыла нарэшце вочы, як бальшавіцкім прыяцелям, гэтак сама і іх ворагам.

У новым моры чыстай крыві нявінных усе убачылі нараджэньне Новай Расеі.

І зразуменьня гэтаго нагнала на прыхільнікаў бальшавіцкай улады ў Расеі жах, а буржуазыі дадала сьмеласьці і прабудзіла чалавечыя ўчуцьця. Сацыялісты крычаць маскоўскім палачам, каб яны апамяталіся, спынілі непатрэбны і шкадлівы тэррор, які пагубіць ня толькі іх саміх, але падвядзе і іх „таварышаў“ у іншых странах. А буржуазыя, пераканаўшыся ў тым, што „не такі чорт страшны, як яго малююць“, і што раней, ці пазней трэба будзе растацца з чырвонымі панамі ў Расеі, рашуча зьмянілі пазыцыю, як адносна Радавай Расеі і трэцяга інтэрнацыяналу, гэтак сама і сваіх работнікаў

Англійская ніжэйшая палата дэпутатаў вынясла

закон, забараняючы гэнэральныя забастоўкі

і збіраньне ахвяраў для бастуючых. Гэта нябывалы ўдар для работніцкай клясы, якая дагэтуль карысталася свабодаю забастовак у самых рэакцыйных дзяржавах, ня лічачы, вядома, радавай Расеі. Прыклад Англіі знойдзе водгук і ў іншых дзяржавах, дзе работнікі трымалі сваю буржуазыю страхам чырвонага пужала.

Нямецкі міністар заграгічных справаў Штрэзэман, ня гледзячы на асабістае спатканьне з Чычэрыным і на хаўрус з Радавай Расеяй, адкрыта заявіў, што

Нямеччына выступае на барацьбу з III інтэрнацыяналам,

што ў сутнасьці азначае перамену фронту адносна радавага ураду.


Усе тыя дзяржавы, як Чэха-Славакія Швэйцарыя, Юга-Славія, Румынія, Вэнгрыя, Баўгарыя і інш., якія дагэтуль хісталіся, ня ведаючы, прызнаваць радавы ўрад, ці не, цяпер адразу занялі выразна нэгатыўную пазыцыю да гэтага пытаньня. А тыя з дзяржаваў, як Італія, Францыя, Літва, Эстонія, Фінляндія, Турцыя, Грэцыя і інш., у каторых адносіны з бальшавікамі былі больш меньш наладжаны, гэтак сама падпарадкаваліся агульнаму антыбальшавіцкаму настрою і далучыліся да адзінага фронту барацьбы з камунізмам.

Балканскія дзяржавы рыхтуюцца на скліканьне канфэрэнцыі,

на якой павінны быць абгавораны спосабы барацьбы з камунізмам. Усе непаразуменьні між асобнымі дзяржавамі, якія маглі цемна адбівацца на агульнай барацьбе з бальшавізмам, устраняны. Вялікія апаскі выклікала разнагласься на канфэрэнцыі Англіі, Японіі і Амэрыкі ў Жэнэві па пытаньню аб абмежаваньні марскіх узбраеньняў. Але і тут нарэшце зазначылася палепшаньне. Японія пайшла на вуступкі перад Англіяй і ёсьць надзея, што ўсё ўладзіцца добра, і што англійска-амэрыканска-японскі фронт не страціць свайго адзінства, сілы і значэньня.

N.

ПРЭЗЫДЭНТ І. МАСЬЦІЦКІ.



Вільня 2 ліпня першы раз вітала ў сваіх мурах Вышэйшага Прадстаўніка Дзяржавы.

Апошнія навіны.

З ПОЛЬШЧЫ.

АМЭРЫКАНСКАЯ ПАЗЫКА ПОЛЬШЧЫ.

У Варшаве закончыліся перагаворы аб заграцічнай пазыцы з прадстаўнікамі амэрыканскіх капіталістаў. Амэрыканскія банкіры пазычаюць Польскаму Банку 15 мільёнаў даляраў на кароткі тэрмін. З гэтай сумы 10 міньёнаў будуць вызначаны на эканамічныя мэты, а 5 — на засіленьня запасаў Польскага Банку.

Польска—Радавыя адносіны.

Перад выездам да Вільны маршалак Пілсуцкі меў конфэрэнцыю з міністрам заграгічных справаў Залескім Тэмаю конфэрэнцыі былі пытаньні, зьвязаныя з ліквідацыяй скуткаў забойства пасланніка Войкава. У выніку гэтай конфэрэнцыі польскі пасланнік у Маскве атрымае у бліжэйшыя дні інструкцыі для вядзеньня перагавораў з Чычэрыным аб гэтым пытаньні, назначэньні новага пасланніка ў Варшаву і далейшых перагавораў аб гарантыйным дагаворы.

КОНФЭРЭНЦЫЯ ПА ПОЛЬСКА-РАДАВАМУ ПЫТАНЬНЮ.

У панядзелак Маршалак Пілсудскі выехаў з Вільны да Варшавы. У Беластоку салёновы вагон Маршалка быў прычэплены да пасьпешнага цягніка Масква—Варшава, якім ехаў польскі пасланнік у Маскве Патэк. У далейшай дарозе да Варшавы Маршалак радзіўся з пас. Патэкам. Перад выездам з Масквы п. Патэк некалькі разоў спатыкаўся з Чычэрыным, з якім абгаварываў польска-радавыя пытаньні. Учора адбылася пад кіраўніцтвам Маршалка першая конфэрэнцыя па гэтаму пытаньню з удзелам мін. Залескага і пас. Патэка.

ПОЛЬСКІЯ АВІЯТАРЫ У РУКАХ Г. П. У.

Некалькі дзён таму назад два польскія лётчыкі з ІІ лётнічага палку ў Лідзе заблудзіліся каля Стоўбцаў і пераляцелі бальшавіцкую граніцу. Нарэшце яны спусьціліся ў Менску па аэрадроме. Яны заявілі бальшавіцкім уладам, што выляцелі з Вільні да Варшавы для спатканьня амэрыканскага авіятара Чэмбэрлена. але з прычыны дажджу і буры заблудзіліся. Бальшавікі іх інтэрнавалі. Не выключаецца магчымасьць, што бальшавікі абвінавацяць іх у „шпіянажы“.

З ЗАГРАНІЦЫ.

Зварот у палітыцы Нямеччыны.

Поўафіцыяльны ворган міністра Штрэзэмана „Taegl. Rundschau“ зьмяшчае тэлеграму з Нью-Іорка, ў якой паведамляецца, што ў часе перагавораў прэзыдэнтаў эмісыйных банкаў былі закрануты між іншым і пытаньня аб перагляде пляну Давуса і эвакуацыі францускімі вайскамі Прырэйнскай вобласьці. Узамен гэтага Нямеччына павінна далучыцца да антыбальшавіцкай акцыі. Аднача̀сна газэта зьмяшчае цэлы рад вестак з Радавай Расеі аб новых казьнях і аб прамове Калініна, абяцаўшага захаваць тэррор. Да гэтых вестак газэта далучае, што прамова Калініна стабілізуе і санкцыянуе панаваньне катаў у Расеі.

АНГЛІЯ НЯ ПРЫЙМАЕ РАДАВЫХ ВЭКСЭЛЯУ.

Некалькі нямецкіх і аўстрыйскіх банкаў прабавалі вучэсьць на лёнданскай біржы нейкую лічбу радавых вэксаляў на агульную сумму ў полмільёна штэрлінгаў, адная-жа Лёндан адмовіўся учытываць бальшавіцкія вэксэлі. Гэта павінна падарваць бальшавіцкі крэдыт у Нямеччыне, якая адпускала бальшавікам тавары пад вэксэлі, якія затым вучытывала ў лёнданскіх банках, а апошнія ўжо прад'яўлялі гэтыя вэксэля бальшавікам для аплаты.

НЯУДАУШЫЙСЯ ЗАМАХ ЦІ ПРАВАКАЦЫЯ?

Француская паліцыя раскрыла рыхтаваўшыся замах на жыцьцё радавага пасланніка Ракоўскага. Замахоўцы ў ліку 7 асобаў арыштаваны. Гэта расейцы, працуючыя на адной з парыжскіх фабрык. Дзеля таго, што указаныя асобы нядаўна прыбылі з Радавай Расеі, дык дапушчаюць, што гэты загавор быў у сутнасьці актам бальшавіцкай правакацыі

ФІНАНСЫ І ГАСПАДАРКА.

ЗЕМЛЯРОБСТВА У ПОЛЬШЧЫ.

Дзеля таго, што Польшча зьяўляецца напалову землеробнаю дзяржаваю, цікава бліжэй пазнаёміцца з становішчам гэтай галіны прамысловасьці. Абрабляемая зямля ў Польшчы займае каля '48% усяго прастору дзяржавы, што складае прыблізна 18,5 мільёнаў гэктараў. Зямлі пасяўной, з якой зьбіраўся ўраджай ў мінуўшым годзе, каля 16 міл. гэктараў, а рэшту складаюць пяскі, горы, пазьбішчы і г. д. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў працягу апошніх 5 гадоў прастор абрабляемай зямлі павялічыўся на 1 міл. гэкт. Затым, апрача павялічэньня прастору, побач ішло і павялічэньне земляробнай культуры шляхам штучнага 'ўдабрэньня і пасеву больш цэнных прадуктаў, як пшаніца, буракі, лён, хмель і інш

З кожным годам, пасьля вайны, заметна павялічэньне выдайнасьці гэктара зямлі і павольнае прыбліжэньне да даваенных нормаў, а ў некатарых адносінах 1925 год перавысіў нават даваенныя. Сярэдняя выдайнасьць за апошнія пяць гадоў толькі для пшаніцы не дасягнула даваеннай нормы, у той час, як некатарых відаў збожжа нават перавысіла гэты ровень. Гэтак у 1909 -1913 г. адзін гэктар у сярэднім даваў: пшаніцы—12,4 квінталяў (квінталь—100 кілаграмам), жыта—11,2 кв., ячменя—11,8, а 1292—1926 г., пшаніцы—11,7 кв., жыта—11,2, ячменя — 12,3 і аўса—11,7 кв., Гэта дасягаецца павялічаным стасаваньнем штучнага гною і лепшаю абработкаю зямлі. Гэты факт дае права спадзявацца, што з часам Польшча ў адносінах земляробства зраўняецца з Заходнімі Эўрапэйскімі дзяржавамі.

Мінуўшы 1926 г. быў, як ведама, няўраджайны. І шчасьця яшчэ, што ён наступіў пасьля вельмі ўраджайнага 1925 г., ад якога засталіся ў стране дужыя запасы збожжа. Аднак-жа гэта не ўратавала ад значнага прывозу збожжа з заграніцы, хаця значны разьмер імпарту, асабліва пшаніцы, тлумачыцца ня толькі няўраджаем 1926 г., але і павялічаным ужываньнем насяленьня, што ўказвае на палепшаньне дабрабыту.

У 1926 г. было сабрана пшаніцы і жыта 63 міл. кв., сярэдні збор гэтых двох відаў за апошнія 5 гадоў складаў трохі больш 63 міл кв., а перад вайною — 74 міл кв. Адсюль відаць, што нехапае яшчэ каля 10 міл. кв. для дасяганьня даваеннага роўню.

З агульнага прастору абрабляемай зямлі дзяржавы 47,3% прыходзіцца на дужую уласнасьць (1921 г.), абшары большыя 50 гэкт., і рэшта на дробную ўласнасьць. Але ў апошнія гады пачалася парцэляцыя і ад 1921 г. распарцэлявана каля 800,000 гэкт. Гэткім чынам дужая ўласнасьць цяпер дасягае каля 17,4 міл. гэктараў, а малая—каля 21,4 міл. гэкт. Аднак-жа буйная ўласнасьць абрабляемай зямлі мае толькі 5,5 міл. гэкт., а малая ўласнасьць — рэшту 13 міл. гэкт. Але, што датычыцца спосабаў абработкі зямлі і наагул высокасьці яе культуры, дык перавага на баку буйнай уласнасьці. Перш-наперш буйная ўласнасьць больш стасуе штучнага гною і сее больш каштаўнейшых відаў збожжа. Адсюль і вынікі значна розьняцца між сабою, як гэта відаць з наступнага параўнаньня:

Сярэдні збор з гэктара ў квінталях па ўсім абшары Польшчы у 1925 — 26 г. складаў для буйнай уласнасьці: пшаніцы — 16,7 і 13,3 кв. (першая лічба адносіцца да 1925 г, другая—1926 г.), жыта — 14,9 і 11,6 кв., ячменя —15,4 і 14, 1 кв. і аўся—14,4 і 12,7 кв. Малая ўласнасьць: пшаніца — 13,1 і 10,6 кв, жыта—12,7 і 9,9 кв., ячмень — 12,7 і 11,7 і авёс—12,7 і 11,3 кв. Адсюль відаць, што выдайнасьць малай ўласнасьці значна уступае буйнай ўласнасьці.

У 1926 г. буйная і дробная ўласнасьць сабралі пшаніцы і жыта з усяго абшару Польшчы наступны лік у мільёнах квінталяў: Пшаніцы: буйная ўласнасьць — 6,4 міл. кв., дробная — 6,4 міл. кв., жыта: буйная 16,1 міл. кв, дробная — 34,0 міл. кв. Прыдавядзеньні выдайнасьці дробнай ўласнасьці да буйнай выдайнасьці пшаніцы першай павінна павялічыцца на 1,6 міл. кв., і жыта — на 7,5 міл. кв. А дзеля таго, што ў бягучым годзе прывоз складае пакуль што 1,5 міл. кв., пшаніцы і 800,000 кв. жыта, дык пры лепшай культуры земляробства мелі бы яшчэ лішку пасьля пакрыцьця прывозу. А, што выдайнасьць дробных гаспадарак можа значна павялічыцца, даказам гэтага служыць Пазнань і гаспадарка Заходня-Эўрапейскіх дзяржаваў, як Нямеччыны, Даніі і іншых, дзе наагул няма буйных абшараў.

Перашкодаю для гэтага служаць апрача паваенных скуткаў і нізкага роўня агульнай культуры, асабліва на Усходніх Крэсах, яшчэ нізкі ровень цэнаў на земляробныя артыкулы і нястача таннага крэдыту для рольнікаў. Узяўшы сярэдні ровень цэнаў на рольныя артыкулы ў 1917 г. — 100, атрымаем сярэдні паказацель для 1922 г. — 76 на рольныя артыкулы і 92 — для прамысловых артыкулаў; для 1923 г. — 73 і — 120. Аднак-жа з 1924 г. палажэньне палепшаецца і выражаецца ў лічбах 113 і 130. У 1925 г. гэты паказацель выражаецца: для рольных прадуктаў — 130 і прамысловых — 120, а ў 1926 г. — 137 і 102. Праўда ўзрост цаны ў 1926 г. выклікан часткова недастатачным ураджаем ў 1926 г. Як уложацца варункі ў бліжэйшай будучыне, пакуль ня можна нічога сказаць. Усё залежыць ад ураджаю гэтага года, а гэтак сама і ад цэнаў на міжнарадовым збожжавым рынку. Да канца траўня былі вельмі благія віды на ўраджай ў Польшчы, але з пачатку чэрвеня наступіў пералом, дзякуючы палепшаньню пагоды і можна надзеяцца на сярэдні, а можа нават і на вышэй сярэдняга, калі пагода не сапсуецца і пазволіць добра сабраць з поля. У Віленскім і Навагрудзкім ваявудзтвах шмат зашкодзіла ўраджаю апошняя бура з градам. Але гэта мала адаб'ецца на агульным стане гаспадаркі Польшчы, якая хоць паволі, але бязупынна паляпшаецца

S.

ЗАБАРОНА УВОЗА ПШАНІЦЫ І МУКІ ДА ПОЛЬШЧЫ.

Паводле загаду рады міністраў забароняны ўвоз пшаніцы і мукі да Польшчы да 1 верасьня г. г.

Адбудова краю.

Цэнтральныя ўлады асыгнавалі дапаўніцельна 205,000 зл. на адбудову Віленшчыны.

Біржа.

Даляры	8,94—8,90 зл.
Рублі зал.	4,60 зл.
Рублі сяр.	2,75 зл.
Чырвонцы	33,— зл.

Збожжа

(Віленшчына)

Жыта (100 кілагр.)	52— 55, зл.
Пшаніца „ „	60 – 63, зл.
Ячмень бравaровы	50— 53, зл.
Ячмень крупяны	47 — 8, зл.
Авёс „ „	47— 49, зл.

Арышты камуністаў у Нарвэгіі.

У зьвязку з аб'яўлянай нарвэскімі камуністамі адозвы да англійскіх маракоў, якіх прызываюць да паўстаньня і вымардаваньня афіцэраў, нарвэская паліцыя зрабіла вобыску памешканьні камуністычнай газэты. У гэтым памешканьні памяшчаліся: саюз нарвэскай камуністычнай моладзі (комсамол) і іншыя камуністычныя арганізацыі У выніку вобыска былі арыштаваны старшыня камуністычнай партыі Фюрэбэтэн, рэдактар газэты Эйнэс, сэкрэтар газэты, камісар „чырвонай запамогі" Луін і сэкрэтар „камсамола" Ліппэ.

КАМУНІСТЫ ЗА ПРАЦАЮ У ЛАТВІІ.

Латвійская паліцыя раскрыла шырокараспаўсюджаную, камуністычную арганізацыю. Арыштавана пакуль 8 асобаў. У іх знойдзена шмат вельмі паважнага матэр'ялу, з якога вынікае, што мэтаю гэтай арганізацыі было паведамленьне радавага ўраду аб стане латвійскай арміі і паліцыі Весткі гэтыя перасыналіся праз граніцу. За гэта адтрымлівалі ад радавага ўраду грошы. Далейшае сьледства вядзецца.

Балканы проці камунізму.

З Афінаў паведамляюць, што пасьля доўгіх дыплёматычных перагавораў аб скліканьні конфэрэнцыі прадстаўнікоў усіх балканскіх дзяржаваў па пытаньню аб стварэньні адзінага фронту барацьбы з камуністычнаю прапагандаю на Балканах грэцкі ўрад выслаў урадам Турцыі, Баўгарыі, Юга-Славіі, Румыніі і Вэнгрыі запрашэньня на гэту балканскую конфэрэнцыю, якая адбудзецца восеньню ў Афінах ці Салоніках.

Новы пералет з Амэрыкі да Эўропы.

Амэрыканскі авіятар Байрд пераляцеў з Нью-Іорка да Эўропы на аэрапляне „Амэрыка" з двумя пасажырамі — тэхнікам і радіо-тэлеграфістам, які ўвесь час палёту высылаў радіо-тэлеграмы з апарату. Праляцеўшы над Парыжам, ён скіраваўся далей на Усход, але ад нявыясьняных повадаў упаў у мора ў 200 мэграў ад берага. Усе пасажыры шчасьліва дабраліся ўплаў да берага.

ЗАІГРЫВАЮЦЬ З ЯПОНІЯЙ.

Чычэрын па прыезьдзе з заграніцы запрасіў да сябе японскага пасланніка, праз якога запрапанаваў японскаму ўраду заключыць гарантыйны трактат.

ЯПОНСКІЯ ВАЙСКА У МАНЧЖУРЫІ.

Японія значна павялічывае лік сваёй арміі ў Манчжурыі. У некаторых месцох японцы будуюць украпленьня.

Перамога гэн. Шэка.

Палуднёвыя вайска нанкінска-шанхайскага гэн. Шэка здабылі горад Ганк-Чанг, Гэн. Шэк, карыстаючыся з перамогі, вельмі энэргічна выступае проці камуністычных агітатараў нерасейскага пахаджэньня, а расейцы не зьяўляючыся ўрадоўцамі кансуляту, павінны пакінуць край ў працягу 24 гадзін.

У ВІЛЬНІ.

(З творчасьці маладзейшых белар. паэтаў).

Калі прыдзецца, браточкі,
Вам у Вільні пабываць,
Дык прашу вас, сакалочкі,
Гэты вершык прачытаць.
Вільня — горад старадаўні,
Што захочашь, то знайдзеш:
Рэстараны, або страўні,
Ты тут пэўне ні мінеш.
Самаму мне было ладна
(Во і я ў Вільні быў),
Раскажу я вам прыкладна,
Як я час тут правадзіў:
„Я іду так па Нямецкай,
Ды гляджу на ўсе бакі,
Грошы маючы ў кецке
Быццам, барын я які.
Хоць і есьці мне ахвота,
Даўно булку-бы купіў,
Каб ня шкода было злота,
Што я потым зарабіў.
Я іду, ды прыглядаюсь,
Што напісана ёсьць тут
Гэтак з вуліцы зблуджаюсь,
Ў невядомы нейкі кут.
І падумаў — кепска рада,
Каб каго тут запытаць
Азіраюсь, ажно з заду
Ціха два хлапцы стаяць.
Толькі я к ім павярнуўся,
Раптам чую іхні крык.
Большы меншаму па вуху
Стукнуў так аж той панік.
Меншы зараз страпянуўся,
Ды да большага ўскок
Дый ізноў яму па вуху,
Той зваліўся, як клубок.
За што гэта — я пытаю:
Гэтак біцца, лайдакі,
Большы кажа: добра знаю
Чалавек ён ёсьць які.
— За цябе мы, дзядзька, б'емся,
Кажа меншы мне дзяцюк,
Ніяк толку не даб'ёмся,
Ці мужык ты, ці шляхцюк.
— Ен мне кажа: як мужык ты
То шэсьць пальцаў на назе
А я цьверджу, што чатыры,
Бо ты шляхціц ёсьць сабе.
Ну дык кіньце, хлопцы, біцца,
Я вас зараз пагаджу,
Вось вы будзіце дзівіцца,
Як я пальцы пакажу.
За каго тады палічыць
Мяне кожны тут із вас,
Калі пальцаў пяць палічыць
На назе маей, якраз.
— Ты ня праўду, дзядзька, кажаш,
Ты сьмяешся толькі з нас.
Пакуль пальцаў не пакажэш
Біцца будзем увесь час.
Я вас зараз успакою,
Каб мне зараз сесьці дзе?
— Каля гэтага пакою
Вось тут лаўка для цябе.
Я тут зараз разьвярнуўся,
Скінуў вопратку далоў,
З ботаў новых я разуўся
І лічыць быў ужо гатоў.
— Ну лічыце, недаваркі,
Колькі пальцаў у мяне!
І кідаю погляд яркі,
Аж кальнула штось мяне.
Дзе-ж падзеліс мае хлопцы?
Я сюды вірк і туды...
І кручуся, бы ў чаропцы
Іх застыглі і сьляды.
А пасьля сабе падумаў —
Захацелі асьмеяць
І панчоху я насунуў,
Хацеў боты надаваць.
Павярнуўся я ў права,
Маіх ботаў ня відаць,
Я пазнаў, што кепска справа
За халат хацеў узяць
Тыц у перад, тыц узад,
На ратунак пачаў зваць,
Бо з грашмі прапаў халат,
Ды і ботаў ня відаць.
Ну і далі мне ратунак:
Завялі па пастарунак,
Што спакой я нарушаю,
Кажуць, кару атрымаю.
Як сказалі, так зрабілі:
На два тыдні пасадзілі.
Адсядзеўшы там два тыдні,
Хоць мне добра давялося,
Сьмехі твораць дома злыдні
Што у Вільні удалося —
Адзін кажа: купіў боты,
Другі кажа што халат.
І сьмяецца ўсяк з ахвотай,
Што наш цёмны, цёмны брат.

Ул. Вецер.

Камуністам горача у Кітаі.

Да гэтай пары найбольшым ворагам камунізму ў Кітаі быў пэкінска-манчжурскі дыктатар Чанг-Тсо-Лін. У апошні час Нанкінскі дыктатар Шэк заключыў саглашэньня з Мангольскім дыктатарам Фэнгам, паводле якога ўсе радавыя грамадзяне павінны пакінуць тэрыторыю Кітая. Фэнга да гэтай пары падтрымлівалі бальшавікі грашова і людзьмі. У Кантоне арыштавана 7 вучняў ваеннай школы па падазрэньню ў адносінах з камуністамі. Усе арыштаваныя растрэляны.

І адсюль выгналі.

Паводле англійскіх крыніцаў радавы камісар Барадзін выехаў з Ханькоў, дзе быў дарадчыкам поўкамуністычнага ханькоўскага ўраду, да Масквы. Выезд гэты наступіў на скутак ультыматыўнага жаданьня гэтага кантонскага гэн. Шэка.

КАНЕЦ „РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ" РЭСПУБЛІКІ У ХАНЬКОУ.

Пасьля ультыматума, даручанага гэн. Шэкам і Фэнгам ханькоўскаму ўраду аб падпарадкаваньні ім і разрыву з камуністамі, у Ханькоу адбыўся новы пераварот. Ен быў ускоран наступленьнем атрадаў Шэка і Фэнга на Ханькоў. Афіцэры ханькоўскай арміі на чале з гэн Тантам занялі ўсе ўрадовыя будынкі, распусьцілі работніцкія і сялянскія арганізацыі і разаружылі рабочыя атрады. Правадыры камуністаў уцяклі.

У. С. С. Р.

Масавыя растрэлы.

Трыбунал у Бэрдычэве асудзіў 18 чалавек да растрэлу, а 28 — да турмы.

РАСТРЭЛ ПАЛЯКА У МЕНСКУ.

Менскі трыбунал прыгаварыў аднаго паляка Савіцкага да растрэлу, а 6 — да турмы быццам за „шпіянаж" на карысьць Польшчы.

ПРАСЬЛЕДАВАНЬНЕ ДУХАВЕНСТВА.

На цэлым абшары С. С. Р. Р. пачалося новае прасьледаваньне духавенства. Арыштаваны галава праваслаўнай царквы ў С.С.Р.Р. мітрапаліт Сэргій. На Украіне арыштавана і выслана ў Сыбір 18 сьвяшчэнікаў. У Армэніі забаронен зьезд духоўных.

Апазыцыя расьце.

Паводле нямецкіх крыніцаў апазыцыя ў Петраградзе і радзе іншых гарадоў Расеі здабывае сабе з кожным днём новых прыхільнікаў. У апошні час у Петраградзе і Кранштадзе работнікі многіх фабрыкаў вынясьлі рэзалюцыі, скіраваныя проці цэнтральнага камітэту і губэрнскіх выканаўчых камітэтаў. Троцкі знаходзіцца ў цесным кантакце з апазыцыяй на Украіне і у Сыбіры. Рыкаў прапануе пагадзіць апазыцыю з рэштай камуністычнай партыі.

Забойства ката Г. П. У.

У Карпаўскам саду ў Харкаве знойдзен труп у якім быў апазнаны кат Г. П. У. Гадлеўскі меўшы клічку Яшкі хлопальшчыка. Гадлеўскі займаў пасаду ката-растрэльшчыка ў працягу 6 гадоў, спачатку ў харкаўскай чрэзвычайцы, а затым у Г. П У. Гадлеўскі быў задушаны.

НЕЗАДАВОЛЯНЫ ПРАТЭСТАМІ СВАІХ.

У радавых колах зрабіла вельмі няпрыемнае уражэньня тэлеграма англійскай рабочай партыі да Рыкава, пратэстуючая проці масавых казьняў бяз суда. У тэлеграме гаворыцца, што падобныя факты выклікаюць абурэньне сярод англійскай апініі, асабліва ўплывае на пагаршэньня адносінаў рабочай партыі да Радавай Расеі

ЗАМАХ НА ГМАХ Г. П. У. У МАСКВЕ.

Агэнты „чэка" адкрылі падгатаўляўшыйся плян узрыву гмаху Г. П. У. у Маскве. Замахоўцы нейкі Захарэвіч-Сульц, Абэрнут і Вазнесенскі згінулі ў часе перастрэлкі з патрулямі Г. П. У. Абэрнут, з пахаджаньня латыш, раней сам быў чэкістам, а пасьля працаваў з САВІНКАВЫМ.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ БЕЗРАБОТНЫХ У ЛЕНІНГРАДЗЕ.

У мінуўшую суботу ў Петраградзе адбылася вялізарная дэманстрацыя безработных, у якой прынялі ўдзел больш 100,000 асобаў. Выступала з прамовамі 140 аратараў. Адзін з сябраў петраградзкай рады Корэскаў жадаў звальненьня працуючых на фабрыках работнікаў на 3 — 4 месяцы і замены іх безработнымі Многія аратары рэзка нападалі на радавы ўрад. Вельмі цікава, што радавая прэса, як петраградзкая, гэтак сама і маскоўская, маўчыць аб гэтай дэманстрацыі.

РАСТРЭЛ ПОЛЬКІ ВІСЬНЕУСКАЙ.

Харкаўскі акружны суд прыгаварыў на сьмерць польку Алёну Вісьнеўскую, абвіняўшуюся ў „шпіянажы" на карысьць Польшчы. Прыгавар выкананы.

Растрэл чэкісты.

У Омску разстрэлян на суду агэнт Г. П. У. Сергееў, які пракраўся, злоужываючы сваею уладаю і растрэліваў па ўласнай ініцыятыве. (Цікава, што растрэляны толькі адзін чэкіста, за тое, што робяць усе іншыя. Нешта не так. *Рэд.*)

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў МАСКВЕ.

У Маскве за апошні час арыштавана 12,000 асобаў, пераважна інтэлігэнцыі і купцоў. Усе турмы і падвалы „засьценкаў" чразвычайкі перапоўняны. А хто ня зьмясьціўся, тыя высланы да Сыбіры і на Салаўкі. У месьці пануе агульны перапалох і паніка, большыя, чым ў 1917—18 г.

ПАПРАЎКА. По недагляду карэктара у пачатку перадавога артыкулу надрукована „Народныя Нацыяналісты" і „Эндэкі", замест „Сацыялісты" і „Эсдэкі".

Тутэйшая хроніка.

— **УРАЧЫСТАСЬЦЬ КАРАНАЦЫІ МАЦІ БОЖАЙ ВОСТРАБРАМСКАЙ.** 2 ліпня адбылася ўрачыстасьць каранацыі Маткі Божай Вострабрамскай, у якой прыняў удзел Прэзыдэнт Рэспублікі Ігнацы Масьціцкі, прэм'ер маршалак І. Пілсудскі, міністры Медзінскі, Гомоцкі, Мейштовіч, Незабытоўскі, віце маршалак сойму Зьвержыньскі, віце-маршалак сэнату кс. Стыхель, кардынал арб. Какоўскі з Варшавы арх. Глода і 16 япіскопаў з рожных польскіх парафіяў. Апрача гэтага прыбыла каля 400 ксяндзоў з рожных парафіяў і каля 600 віленскай парафіі. Багамольцаў сабралася больш 15,000 асобаў Увесь горад быў пекна дэкараваны нацыянальнымі штандарамі і зелянінаю, а вечарам багата ілюмінаваны.

На другі дзень адбыўся ваенны парад на вул. Ад. Міцкевіча, які прыймаў асабіста Прэзыдэнт Рэспублікі. Маршалак Пілсуцкі на ваенным парадзе ня быў. У панядзелак а 9 гадз. рана Прэзыдэнт Рэспублікі, Маршалак Пілсуцкі, міністры і заграгічныя пасланнікі як і ўсе высокія госьці выехалі з Вільні да Варшавы.

— **СУХОТНЫ ІНСТЫТУТ.** У рубрыцэ „з жыцьця Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры" Сель-Ніва у № 50 падае „справаздачу" з дзейнасьці гуртка Інстытуту ў Гайніне Баранавіцкага павету. З гэтай справаздачы відаць, што гуртог фактычна абсолютна ніякай працы ад жніўня 1926 аж да гэтага часу ня вёў. Толькі раз наладзіў разам з гуртком у Мядзьведзічах „лекцыю". Але хто чытаў лекцыю і як не пададзена... Дык ужо мы дададзім: усё тая-ж самая цёмная фігура Цеплоўскага, якога ў двух нумарах падрад Сяль-Ніва ругае! Сухотны інстытут, сухотны цэнтр, дзіўныя супрацоўнічкі.

— **ПАМЫЛІЛІСЯ.** „Сяль-Ніва" у № 50 у рубрыцэ „Беларусы перамагаюць" піша: эндэцкая польская газ. „Dz. Wil." у сувязі з выбарамі ў валасныя рады, піша наступнае: „Сьледам за правалам польскіх выбарных сьпіскаў да самаўрадаў у некаторых паветах Віленшчыны, а між іншым і ў Маладэчанскім павеце, дзе Палякі здабылі мізэрны працэнт галасоў, польскія сьпіскі панясьлі новы правал. У выніку нядаўна праведзяных выбараў у валасныя рады ў Слонімскім і Несьвіскім павеце беларускія сьпіскі атрымалі 80 прац. мандатаў". Дык інформуем дадаткова „Сель-Саюз": у гэтых паветах працаваў толькі адзіны нашы Беларускі Выбарны Нацыянальны Камітэт і толькі дзякуючы яму беларусы атрымалі гэтыя 80 проц.!

— **„СЯЛЯНСКІЯ ПРАВАДЫРЫ".** У папярэднім нумары мы падалі доказы, што Гагуль-Яраміцкі „Сель-Саюз" у сялянскіх выбарах на гмінах ніякага удзелу не браў, усе свае шчуплыя сілы кінуўшы на барацьбу за цёплы мандат раднага ў Віленскім магістраце. І толькі цяпер, пасьля свайго скандальнага правалу на выбарах у Вільні Сельсаюз кінуўся да забытых ім сваіх родных сялян. І вось у № 50 ад 29 чэрвеня у сваім воргане „Сяль-Ніве" сельсаюзьнікі разразіліся нарэшце адозвамі да выбаршчыкаў, заклікаючы галасаваць за сьпіскі беларускіх сялянскіх кандыдатаў. А ці Сельсаюз дзенебудзь гэтыя сьпіскі рабіў? У гэтай адозве ад 29 чэрвеня „Сяль-Ніва" „перасьцярагае сялян перад агэнтамі Паўлюкевіча", гэта значыць перад сябрамі і інструктарамі Беларускага Нац. Выбарнага Камітэту, які адзін толькі вёў выбарчую акцыю і там, дзе яе вёў, дык усюду прайшла вялікая большасьць шчырых беларусаў нацыяналістаў.

Пустазвоны — дэмагогі пішуць далей ў сваей адозве: „трымайцеся толькі сваіх сялянскіх, мясцовых, беларускіх, сьвядомых парадні каў (?) і ідзеце за іх радай".

Але дзе гэтыя параднікі, адкуль яны павінны ўзяцца бож міфічаскі Выбарны камітэт „Сельсаюзу" ня выслаў ані воднага гэткага парадніка?! (Бо іх ня мае!)

Далей пустазвоны пішуць: „каб магчы сьлядзіць (?) за выбарамі і даваць сялянам нарады (сідзячы ў Вільні!) ў справе выбараў, просім усіх(!!!) сялян выбаршчыкаў прысылаць у рэдакцыю (а не ў выбарчы камітэт, які не радзіўшыся памёр!) гэткія даныя: 1) на які дзень вызначаны выбары сябраў валаснога сабраньня ў данай вёсцы і г. д.

Гэтыя рады і запытаньні ворган „Сялянскага" саюзу робіць сялянам у № ад 29 чэрвеня тагды, калі ўсе выбары ў Рады гмінныя ў Навагрудчыне скончыліся 29 чэрвеня, а на Віленшчыне 28 чэрвеня!

Вось, дык „абаронцы" сялян!

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Залэмога Ураду для пацярпеўшых ад буры.

Гураган, пранесшыся над Наваградчыною, пазбавіў даху некалькі сотняў сем'яў і паставіў перад пагрозаю голаду і няшчасьця тысячы ахвяраў граду. Пан Ваявода, зараз-жа адправіўшыся на мейсца катастрофы, каб асабіста пазнаць разьмеры няшчасьця, жыва заняўся адшуківаньнем сродкаў для аказаньня помачы пацярпеўшым пры адбудове і новым засеве, дзеля таго, што помач, якую могуць аказаць самаўрады, вельмі нязначная ў параўнаньні з разьмерамі патрэбы. Вынікі гэтых пачынаньняў наступныя:

Міністэрства Працы пераслало ваявудзкаму ўраду 6,000 зл., для экстраннай запамогі. Урад вызначыў на гэту акцыю 200.000 зл., прычым крэдыт гэты будзе ў бліжэйшым часе павялічаны на 100,000 зл. Грошы гэтыя ўжо пачалі выдавацца праз Kasy Spółdzielcze ў пяцёх паветах, пацярпеўшых ад катастрофы, (Навагрудзкім, Слонімскім, Стаўпецкім, Лідзкім і Баранавіцкім).

У Варшаве, куды выехаў п. Ваявода з мэтаю асабістага падтрыманьня сваіх стараньняў, адтрымаў крэдыт у разьмеры 400,000 зл., выключна на патрэбы земляробства пацярпеўшага ад гурагану насяленьня. Крэдыт гэты будзе павялічаны на 200,000 ЗЛ. ДЗЯРЖАУНЫ BANK ROLNY абяцаў крэдыт для сялян на выключна карысных варунках ў разьмеры 500,000 зл. Апрача гэтага п. Ваявода чакае ў бліжэйшыя дні вызначэньня крэдыту ў разьмеры АДНАГО МІЛЬЕНУ зл., спэцыяльна на адбудову на карысных варунках. Дзерава ў дзяржаўных лясох, выдаецца на адбудову на вельмі карысных варунках.

Але ўсяго гэтага яшчэ далёка недастатачна, каб задаволіць вялікую патрэбу пацярпеўшага насяленьня. Маем надзею, што ўрад не застановіцца на гэтых першых кроках экстранай запамогі няшчасным ахвярам стыхійнай катастрофы і задаволіць ў поўным абыйме патрэбы пацярпеўшага насяленьня.

УВАГА, БРАТЫ БЕЛАРУСЫ! Зьвяртайцеся за запамогамі да сваіх нова-выбраных гмінных самаўрадаў.

СЛОНІМШЧЫНА.

(*В. Явар Рагадзянскай гміны*)

Праз вёскі Явар, Сатэўляны і Рагоўшчыну прайшоў страшэнны гураган. Ў кожнай з гэтых вёсак няма такай хаты, якая ня былаб разрушана віхрам. Ў в. Сатэўлянах і Явары жудасны малюнак бяды. Людзі апусьцілі рукі ад вялікага гора... Дом сьвяшчэньніка і царква зусім разваленыі Досьць шкоды на палёх, у лесе, ўсюды поўна сьлядоў урагана. Адзін чалавек забіты, ёсьць раненыя. Аднаго пастушка гураган нёс ў паветры больш 200 мэтраў і кінуў паміж гальля старай грушы, цяжка ранячы яго - Страшэнны абраз! Старыя людзі зусім не памятаюць такай бяды.

Ў хуткім часе пасьля урагана прыехалі: Наваградзкі ваявода — Бэчковіч, Слонімскі стараста— Др. Дораш, павят. коменд. паліцыі - Маеўскі і шмат інш. урадаўцаў. П. ваявода зараз жа на мейсцы даваў фінансавую дапамогу найбалей пацярпеўшым. Старшыня Рагацянскай воласьці пачаў реестрацыю зробленай ураганам шкоды.

Праз некалькі дзён прыехаў туды прадстаўнік Белар. Нац. Рады ў Слонімшчыну з мэтай, даведацца чаго найбольш патрэба і даць парады.

Жыхары вышэйпамянутых вёсак просяць каб:

1). Зараз-жа быў урадам асыгнаваны спэцыяльны крэдыт найбалей пацярпеўшым.

2). Каб П. Д. У Б. (страховачная Дырэкцыя) выплаціла $^{1}/_{3}$ часьць страхоўкі пацярпеўшым.

3). Каб „Nadleśnictwo" адпусьціла дарма дзерава на будову новай царквы.

Гэта ёсьць скромныя жаданьні сялян — беднякоў, якія, маем цьвёрдую надзею, урад польскі здзейсьніць.

Цікава адзначыць, што „дабрадзеі" з Сельсаюза ў асобах паслоў Рагулі, Ярэміча, ці іншага чорта — нават не пацікавіліся прыехаць і, як „вельможныя паны п...аслы" даць людзям помач са сваей тысячнай пэнсыі, можа ў варшаўск. рэстаранах.

А мо' па мандаты заедуць калі...

Nemo.—

Слонімская хроніка.

Нікано Кічан з в. Міжавічы, аб якім ужо пісалася ў „Белар. Слове" нядаўна уцёк адтуль да Менска. Цяпер прыслаў пісьмо сям'і з якага відаць, што ня рады ён з бальшавіцкага „раю" і гатоў вярнуцца .. Не пара!

А колькі ёсьць яшчэ шпікоў-чэкістаў у нас, якія за маскоўскія чырвонцы баламуцяць сялян і абяцаюць на землі „чырвонае счасьце"...

Якое давер'е ў нашых сялян мае Ярэміча нейкій „Саюз" можа служыць факт, што ні ў адну Валасную Раду ў Слонімшчыне грамадзянства не хацела выбіраць тых людзей, якія маюць хаця-бы толькі асабістую сымпатыю да асобы сьмешнага палітыка і яга Саюза, а такіх асоб пакуль-што ў нас ёсьць адна — на тысячу інш.—Чы гэта не навука для „Саюзаў Самахвалаў"?

Быў час, што збанкрутаваны цяпер Рагуля і Ярэміч вельмі кахалі вёску Чамеры, Слонімск. пав, і нават заглядалі часта туды (спэцыяльна!). Прайшла, не вярнецца...

Цяпер-жа Ярэміч, будучы ў Слоніме 13 VI г. г. не „ізволіл" ўступіць нават да вёскі, якая знаходзіцца толькі ў 3-х кілямэтрах ад Слоніма.

Відаць „патэнтаванаму беларусу было трошкі баязна зьяўляцца туды... А шкода!

Паміж нашымі сялянамі, якія дастаюць газэцінку Рагулі бязплатна, ідзе цяпер гутарка на тэму, чаго так часта і густа можна бачыць на старонках „С. Нівы" словы: „дэфэнзыва, даносчык, правакатар", — а чаму нідзе няма „Чэка, чэкісты"? Разумныя людзі (сермяжнікі) кажуць проста гэтак: „Галоднаму (Рагулі) хлеб на думцы" і „Якога хто мыла раніцай ужывае, такім запахам (?) праз цэлы дзень ваняе (ужывае!)

13 VI. 27 былі выбары сябраў Валаснога Сабраньня ў абводзе Селявічы, ў склад якога вайшлі вёскі: Селявічы, Вязэвічы, Юхнавічы і Варонічы. Мелася выбіраць 30 сябраў. Усе сябры Камуністычнай партыі З. Б. з правадырамі і кіраўнікамі ячэяк гатаваліся ўзяць найбольш мандатаў, а тут перашкода: шчыльна, дружна і ахвотна прыйшлі першы раз ў сваім жыцьці на сабраньне ўсе кабеты вёскі Сялявічы і далі свае галасы за чэсных нацыяналістаў—беларусаў, бяручы такім спосабам з агульнага ліку 30 — 18 мандатаў для Сялявіч!!

Чырвонай шайцы міжнародных бандытаў першы раз Сялявіцкія жанчыны далі маральны адпор!

Добра нашы кабеты зразумелі цяпер, што чырвоныя зладзеі дабра нікаму ніколі не далі (апрача Чэка!) і не дадуць!

Галасаваць йшлі жанчыны, якія лічаць 60—65 гадоў, ня кажучы аб маладзейшых!

Кабеты іншых вёсак, гмінаў і паветаў! Бярыце прыклад з нашай вёскі і ганіце чырвоную банду шпікаў--чэкістаў, якія працуюць за маскоўскія чырвонцы!

Прэч з чырвонай бандай чэкістаў!

Толькі і слава кабетам в. Сялявічы, якія зразумелі вагу хвілі і з агідай да хуліганаў маскоўскіх — пайшлі аддаць свае галасы за паважных людзей, шчырых беларусаў, а не тых, якія яшчэ 1921 годзе (Сьцяпан Серкевіч) сьмяяліся з беларускай мовы і якім пахне „Інтэрнацыянал" маскоўскі.

Nemox.

Наша веска.

Наша вёска Доўгі-Лог, Беніцкай гм. Маладэчанскага пав. далёка адкінена ад мястэчкаў, ад станцыяў, і наагул ляжыць, у глухой старане Сялянства пераважна беднае, жыве ў недастатку. Няма з чаго наж ць ані накасіць, мала зусім зямлі.

Найбагацейшым лічыцца ў нас адзін толькі сялянін, які мае 5-ць дзесяцін. Школы ў вёсцы ніякай няма, дзеці растуць, як кажуць, на лес гледзячы. Колькі не стараліся, каб мець школу, але дзе-ж ты зробіш што добрае з нашым братам: адзін хоча, другі няхоча. вось так, як мокрая гарыць, так рабілі школу. Але маем адну пацеху, гэта асобны дом, дзе можна сабрацца і пачытаць газэты, кніжкі і г. д. Цяпер пастанавілі адкрыць гурток „Прасьветы", які будзе дапамагаць у разьвіцьці нашай культуры, якая так моцна патрэбна дзеля нашай вёскі.

На ніякія абяцанкі „пакойвіцы" Грамады, мы ня згадзіліся, не пайшлі пад яе камуністычны сьцяг, а наадварот, — праганялі яе і ейных агітатараў — агентаў. Мы ведалі, што гэта ўсё для нас не карысна і змагаліся з ёю. А да сябе паклікалі адзіную нашу змагальніцу за нашыя правы, за нас і за праўду нашу, гэта Беларускую Нацыянальную Раду!

Браты Нашы! ўсе туды ў Бел. Нац. Раду ў адзін шарэнг, бо гэта адзіная наша заступніца, наша Матка!

Сялянін.

УСЯЧЫНА.

Найвялікшы параход на сьвеце.

У Нямеччыне заканчываецца будова параходу „Нямеччына", які будзе мець 70,000 тонаў паемнасьці. Гэта будзе найвялікшы параход на сьвеце. Хуткасьць яго — 28 вузлоў у гадзіну. Найвялікшыя дагэтуль параходы „Лузытанія", затоплены немцамі ў часе вайны, і „Маўрытанія" мелі па 43,500 тонаў, і хуткасьць — 25 вузлоў, „Тытанік", трагічна згінуўшы перад вайною,—меў 46,500 тонаў. Нямецкі параход гэтай самай назвы, канфіскаваны Амэрыкаю ў пачатку мінуўшай вайны, меў 49,000 тонаў. Гэта быў цуд тэхнікі і навукі Гэта ня плывучы палац, а цэлае места, бо мог адразу зьмясьціць 4,000 пасажыраў з багажом усіх клясаў і меў 1,000 чалавек абслугі. На ім знахадзіліся пекныя салі, кіноматаграфы сады, пляцы для веласыпэднай язды, для ігры ў тэніс, басэйны для плаваньня, рэстараны, кафэйныя і іншыя выгады. Тое, што мог за адзін раз падняць і зьмясьціць у сабе параход „Deutschland", ня можна было зьмясьціць на шмат дзесятках 60—вагонавых цягнікоў.

А цяперашні „Deutschland" на цэлых 21,000 тонаў большы. Адсюль можна сабе прадставіць, які гэта вялікан, калі мець на ўвазе, што найвялікшыя ваенныя крэйсары маюць паёмнасьць ад 20 — 28,000 тонаў, а „брэдгюўты" ня больш 32 — 35,000 тонаў. Для таго, каб даставіць гэтакага вялікана з Эўропы да Амэрыкі, патрэбна некалькі цягнікоў вугля.

Пісьмо

да Старшыні Бел. Нац. Рады.

Паважаны Пане Старшыня!

У нашым Паставскім павеце зьявілася нейкая партыя „Селянскага Саюзу". Нашы сяляне спачатку падумалі, што мо' гэта і добрая партыя. Але, калі я ім вытлумачыў, што гэта партыя грамадаўская і што яна робіць тое самае, што рабіла калісь Грамада, дык нашы сяляне і рукі апусьцілі і цяпер знаць ня хочуць „Сялянскага Саюзу".

Пане Старшыня! прашу Вас выслаць мне праграму і інструкцыю Беларускай Нацыянальнай Рады.

З вялікім ушанаваньнем

Гэнадзі Райчонак

Вёска Рымкі, пав. Пастаўскі.

Клецкая Беларуская Гімназія

Прыймовыя экзамены ў канцы бягучага году адбудуцца ў днях:

ў І кл. — 23, 24 і 25 чэрвеня
ў ІІ, ІІІ, IV, V, VI і VII кл. — 27, 28 і 29 чэрвеня.

Заявы прымаюцца ў Канцэлярыі Гімназіі (м. Клецк, Нясьвіскага пав., 2 Татарская вул. № 4).

Да заявы трэба далучыць:

1. Мэтрыку аб нараджэньні вучня.
2. Пасьведчаньне аб адукацыі.
3. Пасьведчаньне аб прышчэпе воспы.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Навагрудзкая Беларуская 8-х кл. Гімназія

ПРЫРОДА—МАТЭМАТЫЧНАГА ТЫПУ

(І, ІІ, і ІІІ кл. атрымалі няпоўныя правы Паньствовых Гімназіяў).

даводзіць да ведама грамадзянства, што прыймавыя экзамены вучняў на 1927-28 школьны год у-ва ўсе клясы Гімназіі адбудуцца ў наступным часе:

вясною: 22, 23, 24 чэрвеня,
восеньню: ад 1-га да 10-га верасьня.

Заявы аб дапушчэньні дзяцей да экзаменаў падаюць іх бацькі, або апякуны.

Да заявы трэба далучыць:

1) Мэтрыку аб нараджэньні,
2) Пасьведчаньне доктара аб прышчэпе воспы,
3) Дакумэнты аб папярэдняй адукацыі, калі паступаючы вучыўся ў якой школе.

Жадаючыя паступіць у 8-ю клясу, або перавясьціся з іншай Гімназіі у гэтую клясу, павінны зьвярнуцца з просьбаю „Do Kuratorjum Okręgu Szkolnego Białostockiego w Białymstoku" аб дазволе, далучыўшы да паданьня вышэй абазначаныя дакумэнты.

Пры гімназіі ад 8-га красавіка г. г. існуе на кошт Ураду інтэрнат для хлапцоў і дзяўчат паасобку, на наступных варунках:

Памешканьне, апал, сьвятло, жалезнае ложка, прыслуга і наагул уся абстанова — бязплатна; пасьцель-жа і бялізна ўласная.

На утрыманьне бярэцца: ў месяц:

1) 24 кг. жытняй мукі,
2) 4 кг. пшанічнай мукі,
3) 4 кг. круп;
4) 2 кг. сала;
5) 32 кг, бульбы.

Па жаданьню бацькоў, замест прадуктаў можа быць плата ў грашох, паводле каштоўнасьці гэтых прадуктаў.

Заняткі ў гімназіі пачнуцца 1-га верасьня.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Радашкоўская

8-х клясовая коэдукацыйная Беларуская Гімназія гуманістычнага тыпу падаець да ведама, што заявы аб прыйме ў-ва усе клясы можна складаць у канцэлярыі Гімназіі што-дня, апрача дзён сьвяточных, ад 12-ай да 14 гадзіны, або прысылаць па пошце на наступны адрэс:

**m. Radoszkowicze, pow. Mołodeczański
Plac Kościelny 2.**

Да заявы трэба далучыць мэтрыку нараджэньня і, калі ёсьць, дакумэнт аб папярэдняй адукацыі.

Уступныя экзамены ў восень адбудуцца ў дні ад 29 жніўня да 10 верэсьня б. г.

Апошняя станцыя па чыгунцэ — Аляхновічы (Olechnowicze), ад Радашковічаў 8 кілёметраў.

ДЫРЭКЦЫЯ

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.